**Галіна**
**Тврановіч-Сеўрук**

# Ускраек тысячагоддзя

***Вершы***

Мінск
"Мастацкая літаратура"
1996

ББК 84(4Беи)6-5
УДК 882.6—1

**СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ МАТУЛІ**

*Мы — вечныя,*
*пакуль нас сабою засланяюць*
*нашыя мацяркі.*

*Смяротная —*
*драўляны цёплы крыж*
*цалую.*

6.09.91, Дараганава

ISBN 985-02-0202-5
© Г. П. Тварановіч-Сеўрук, 1996

# I
# Крыжа засень

* * *

Абпаленая і перасохлая
у ілжывай бясконцасці
тлумнага дня
зацята шукаю адзінае месца,
дзе яшчэ можна жывою вадою
душу наталіць —
імкнуся ў засень Крыжа.

* * *

Ніцма.
Лямант душы апаў.
Скруха слязою сплыла.
У храме.

* * *

У святло,
у світанне
мяне прывялі
жахлівая незваротнасць
і вялікі сум
аб той хвілі,
калі
маё адзінае жыццё,
зусім неўпрыкмет,
імклівым часам падманутае,
мусіць апасці лісцем сухім
пад крокі наступнікаў.
І, як мне казалі,
не ўзнімецца ўжо ніколі,
бо кароткі век чалавечы...
Толькі — о, літасць! — струна
напятая
маёй тугі —
парвалася!
Душа зведала Вечнасць.
...Цяпер я мару быць смыком,
якога цемра бяжыць.

*25.05.88*

* * *

Калі набягае раса нябесная,
Убіраецца ў сілу маленне.

Пасмялелыя праталіны душы маёй
Нараджаюць сціплыя кветкі лагоды.

Яна струменіць у Вечнасць, туды»
Дзе губляюцца час і прастора зямныя.

Мы маем іх тут, каб, зведаўшы аднойчы
берагі,
Назаўжды стаць удзячнымі —
ТАМ...

* * *

Напругу
размяркоўвае па часе
спружына лёсу.
Разгорнутаю кропкай
ірвецца за парог
чалавечага абсягу.

Заўсягды?!
Паслухайма:
на Пярэспе і Нямізе
званы змякчаюць
рух наканавання.

* * *

Божа!
Насуперак спёкам, якія здрадай
маёю
Табе —
раскашуюцца,
навучы мяне быць удзячнаю.
Дай мне сілы на добрае.
І адымі, калі мыслю благое.
Ачысці крыніцы мае.
Хай бруяцца ў згодзе —
Вера, Надзея, Любоў.

* * *

Ісус —
          Айчына.
Горняй мары —
                    жальба і надзея
У бясконцасць —
                    працяг жыцця.

* * *

А мабыць,
                    улада —
          ад «лад», і «паладзіць», адкуль і
                                        «суладдзе».
Моцы малю, каб дачакацца
міласэрнае самае ўлады —
улады Любові Хрыстовай
над роснай зямлёю...

* * *

Спачуваю добрым намерам,
што звыклі замацоўваць сябе
на крутых шляхах чалавечых
вострымі цвікамі асуджэння.

Спачуваю, а мкнуся пад шаты
адвечнае Бацькоўскае міласэрнасці:
«Не судзіце і не судзімы будзеце».

Зямныя цвікі іржавеюць,
распадаюцца нашыя пабудовы.
Няўдзячная справа — цяслярства
на духаносных прасторах.

Айцец нябесны не мае патрэбы
у нашай слабой абароне.

Ды імпэт фарысеяў і садукеяў
раскашуе ў кожным з нас.
Спачуваю добрым намерам...

* * *

Маўчанне Госпада —
побач,
углядаецца ў абрысы мае душы,
кінутай Ім аднойчы зернем
у раллю жыцця
тутэйшага.
Адтуль —
з паверху Вечнасці.
Богаслаўёная цішыня прарастае
Господняю ласкай.

Маўчанне Госпада —
я заблудзілася,
адышлася,
крыніцы далёка.
Вусцішна, сцюдзёна.
Пазаві мяне,
Божа!

*21.05.88*

**Вялікдзень**

Вясновае зямлі гучанне.
Ціхая ралля маёй слязы.

І зноў прыйшла пара.
Пара завершыць Лёс.
Злучыць два берагі.
Ідзе, ідзе Хрыстос!

*14.04.90, Белград*

* * *

І зноў — вясновая пара!
Рэха, водгук, водбліск...
Дарагі ўспамінак мкне.

Шчыра, палка ўзыходзіць
да расчыненых нябёсаў
велікодных свечак рэй —
па-над сербскім стольным
спеўным, белым градам,
цнотай белаю каштанаў,
Тэразіяй і Калемягданам,
над спатканнем пекным
плыняў ветлых Савы й Дуная...

...Званы Святога Савы
на Врачару —
Найвялікшага ў свеце
Храму Праваслаўнага —
Слухаю ў родным Менску
ля аднаўленай Марыі Магдалены...

*19.03.91 — чэрвень 1993, Менск*

**У храме**

Свячы гарачую слязу,
духмяны жар васковы
і жар вільготны пачуцця
прыкмецяць чуйныя анёлы.
І долу ані кроплі не спадзе
са шчырага твайго памкнення
тваё узнёслае душы малення...

# II
# Смутак і тайна

* * *

Кожны. Усе.
Мы — тайна.
Збалелая тайна
зямлі і нябёс.

*30.03.90, Белград*

* * *

Няўжо
вясновае галіны-долі
цнатлівае трымценне
народзіць
амярцвелы
шэпт кляновага ліста
па восені тужлівай
маёй, тваёй —
агульнай?
Няўжо?!
*22.07.90, Дараганава*

* * *

*Сыну*

«Ці выратуюцца добрыя,
тыя, што не вераць?» —
занепакоенае спытала дзіця.

Чаму ж ім, гэтым добрым,
і справай, і словам, пачуццем,—
ды скаваным бязвер'ем,
выпаў лёс пакутаваць зараз,
а потым, уратаваным ужо,
апячыся наканавана
пранізлівым сорамам,
тым сорамам, што і Фама,
і Саўл — мудры Павел —
зведалі на зямлі,
але справаю свайго жыцця
паспелі шчасліва нядолі той выракчыся,
каб чыстымі дзецьмі ляцець да Айца?
Чаму?
Смутак і тайна.

* * *

Вось зеўрае прастрань тупога адчаю,
і грозіць, і цісне той шлях пад гару.
Цярпення напятага бераг
размыецца зараз журбою.

Астатняю сілай чакаю,
калі ўжо здаволіцца вораг
іспыт вяршыць над душою...

* * *

Дасканалай Любові
асалоду хроснага шляху зведаць
у адчаі прагне знясіленая душа...

Ды атручаны вусны мае.
Засмечаны далягляды.

Ахвяра няўдзячнага часу,
абрыдлая сабе самой жабрачка —
надзею люляю цярпліва:
спакусаў адолею прывід —
маю за павадыра Слова...

*красавік 1990, Белград*

* * *

Долі сваёй далакопы сляпыя,
апраўданне шукаем штодня
пад позіркам светаносным
Вечнасці.

* * *

Ці маю права
іншых пазнаваць праз сябе?
Варагуюць ува мне любоў і нянавісць.
Што пераможа?!
Кожны, мною сустрэты,— лепшы.
У ім зіхціць т а я м н і ц а .

* * *

*А. С. Чабан*

Стратлівы лёс галубіць
агнявою ласкаю сэрца
старое маці.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
«Каго люблю, таго караю».
І трэ таўро абранасці
з падзякаю прыняць...

*7.03.92*

* * *

Было. Каб жа навіна...
Па сухому сунещца дзень.
Кастрышча раскладзена
на самым жывым — душы.
Пякельныя смага, спёка,
маўклівыя стогн, енк,
сухія, бы ўпершыню, вочы.

Ратункам мігціць адно трыванне,
покі ветлая раса не дашлецца
зялёным Дрэвам жыцця,
каб даць голас знямоглай душы
і наталіць смагу па вечным...

Наталіць дзеля новага,
шчэ гарачэйшага шляху.
І гэтак бясконца?!

* * *

Урослыя дзірваны забыцця
тояць у сабе адкрыццё
далягдядаў, сапхнутых часам,
што
праз людзей варагуе з сабою,
а хоча быць пуцявінай,
ветлаю для ўсіх народаў.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Навальніца выгаворвае:
Сусвету Ратай ужо чакае
з аралам падрыхтаваным.

* * *

Усё.
Спапеленыя мажлівасці,
астылы прысак не маёй душы.
Абыду чужую засмягласць,
каб не выпарылася маё
маленне —
адзіная жывая кропля,
якая прагне Адказу.
І раптам:
пранізлівы смутак —
аднойчы Раскрыжаваны
зноў трымціць болем-пакутаю.
У маёй руцэ —
цвік.
Вяртаюся!

*24.05.88*

* * *

Няўрымслівы палетак майго чакання.
Ды ці толькі майго...
Калі ўжо спадуць вярыгі
тутэйшых дня і ночы?..

...Задыханыя, шчыруем над
таемнасцю зорнай пазначаным шляхам...

* * *

Адчайна праціўлюся я ратунку свайму.
А ціхамірнасць шукае хоць шчыліну,
каб душу наталіць жывою вадою.
Ды гаснуць кветкі святліцы таемнае.

Разумею: сама адчыніла я дзверы
таму, што зласліва сцеражэ штодня
крок наш кожны, каб бясконца
распінаць на крыжы Вечнасць.
Разумею... а сілы ступіць у ратунак
не маю...

*23.05.89. Масква*

* * *

З дня ў дзень
выпрабоўваю цярпенне
Госпада.
І хто?
Я — брыдкая кропля
нягеглае плоці.
А Гасподзь —
міласэрны і доўгацярплівы Пакутнік —
з Маці Прачыстай Сваёй
ахінаюць мяне
Покрывам ціхамірнасці ўдзячнае,
каб мяне ад мяне ж
абараніць
і апраўдаць
перад Айцом Нябесным...

# III
# Надзеі парастак

* * *

Надзея маўклівая.
Затоенае дыханне.
Трапяткі й сурочлівы час —
абуджэнне душы,
гнятлівай тугой
прыцярушанай.
Нараджаецца цуд.
Каб жа толькі прасторы
мне стала
Сусвету гулкага
дар жыццядайны
прыняць...

* * *

Неўпрыкмет выспеў час,
калі ў кожным сваім дні
сцішана-вінавата выглядаю
зялёны атожылак вечнасці,
такі даверлівы, кволы,
а пагарджаны, змучаны
плоймай маіх жа памкненняў —
няўдзячных росшукаў
на
шорсткіх шляхах, камяністых палетках
дзе адно пустазелле вольна буяе
пад пільнай аховаю драпежных птушак

* * *

Як памагчы той кволай
завязі духоўнага,
схаванай у душэўным,
якім сеецца напачатку
кожны век чалавечы,
памагчы,
каб вызваліць Існае?..

Пакутна і радасна
шукаю штодня адказ
на адведзеным мне кавалку свету.

* * *

Углядаюся ўглыб свае душы,
зашчэмленай жорнамі тугі.
Цемраю сонечны дзень перацяты.
Паволі гасну
і быццам
знікаю,
але ж яшчэ знаю,
што
ўсё існае нараджаецца ў пакуце,
бо аднойчы,
— і мяне ратуючы,—
быў раскрыжаваны
самы светлы ў Сусвеце
Чалавек...
І вось Ён падыходзіць да мяне.
Клапатліва аглядае лампаду
майго быцця.
...Нараджаецца лагода.
Асанна!

*10.06.88*

* * *

Сусвет распасцёрты над лёсам маім.
Жыцця светаноснага крыж
уздыхам адным працінае глыбіні вякоў.
Абноўленай існасці шлях
рыхтуецца ў ранак Хрыстоў...

* * *

Замасціць дрыгву-адчай,
гардыні-бездані шэрай
выракчыся —
адпакутаваць сабою —
горача імкнуся.

Святочны дзень душы.

* * *

Зрушацца няўмольныя пласты,
зліюцца вымярэнні ў адно.
Часу незваротная хада
навярэджанай душы саступіць,
як дашлецца раптам
прамень адтульнае ўвагі,
Покрыва ўцехі мудрае —
ласкавай лістаношы Вечнасці.

**Жыццё**

У адказнай той вандроўды
зведае амаль што кожная душа
дзёрзкай завязі спакусу —
па ўладзе гордай смагу
ды прагу здрадлівую самасці.

І толькі літасцю адной
Хрыста, за нас распятага,
душы-бунтарцы мо удасца
пыхлівае свабоды
муры абрынуць.
Спазнаць аковаў слодыч,
у ланцугах — размах крылаты,
паслушэнства —
крынічны
вольны
шлях.

* * *

Прывід кволай самастойнасці.
Чалавечая няўдзячнасць —
замах на дар жыцця.
І ўсё ж,
            мабыць,
спакушаныя й абяздоленыя самагубцы —
ахвяры шматаблічнай гардыні —
зноў
            вымольваюць у Айца
пакаранне-узнагароду: шлях зямны,
каб увайсці ў паратунак —
                                    удзячнасць светлую...

* * *

Хваравітую пакуту —
незадаволенасць
зрокам і крокам,
вучуся прымаць
зычліва і ветла,
каб прычакаць
вясновай квецені
ва ўрачыстым садзе —
даверлівай прагі
ціхмянага пачуцця
па дасканаласці
н е д а с я ж н а й .

# IV
# Ускраек тысячагоддея

* * *

Не натоўп —
          зморанае, разгубленае чалавецтва
узыходзіць на ганак.
Вось-вось бразне клямка.
Расчыняцца дзверы.

У некалі абяцаны ратунак
нарэшце мы ўваходзім.
Толькі —
          ці ўсе?..

Хрысце, даруй нам, няверным, нямоглым,
за бясконцасць пакуты Твае...

* * *

Сплывае імглістасць суровых вякоў
над прыхаванымі калісь
                    вяршынямі духу...
Вось дачакаліся:
          выспеліў час
таемныя долю і лёс,
маленне й шлях —
          прагу Хрыста
                    у Беларусі.

* * *

Ажыла званіца
над стольным Менскам.
Анёльскіх хораў
галасы
імкнуць увысь
узнесці горад.

* * *

Сваім
слабым, мітуслівым словам
спрабую выказаць тое,
што выгаворваецца
адно ціншынёю вачэй,
адчыняецца нязмушана,
пакрысе спеліцца часам,
а ва ўладзе паспешлівай натугі —
згасае

## Зямля

Апякуюць анёлы калыску
Бацькоўскіх надзей і трывог.
Вялікаснай міласцю
дбайна агледжаны
лапік Сусвету.
Хрыстовай крывёю асвенчаны
у зорную Існасць парог.

* * *

Абуджаны ў пакуце дух,
пакутай нараджае сябе далей.
Абраннік светлае сцязі,
палоннік вечнае тугі
імкне па стромкім часе.
Вышэй, далей, вышэй!
Туды, адкуль на подзвігі зямныя
дасланы жыццядайным Следам быў.

## **Услед Асі**

А дзяўчынка кветачцы кожнае рада была.
Сем гадочкаў, што сем кароткіх дзянёчкаў,
сама пялёсткавым траўнем цвіла.
Ой ты, салодкая вішанька, у садзе жыцця,
што ж так хутка, так хутка ты
васільковае поле долі свае перайшла...

*3-4.10.90, Масква*

*** * ***

Абняла сясцёр —
Горыч і Роспач.
Лагода
сумны расповед слухала,
са студні ваду насіла
ды па хаце рупілася.
Не абяцала, не дакарала,
адно мудра ўсміхалася
і ціхая бачыла ўжо,
як заглядае ў вокны
новы яе вырай,
а ім, гаспадыням,
тут векаваць ды яе,
Светлую, анямелым
па новай вясне дадому
ч а к а ц ь.

## Тужлівае

Трапеча, дрыжыць:
холадна, боязна
вечаровай парою
галінцы нямоглае.

Вецер шчыруе над светам,
плоць жывую камечыць,
лісцевым покрывай мілуе
застыглыя грудзі зямелькі.

Развітанне пякучым дакорам
зазірае праз вокны ў душу.

*29-30.09. 90, Масква*

* * *

Настойліва
ірдзяная рабіна
хіліцца ўбок ад
іржавай смяцяркі —
да вясёлых арэляў,
дзіцячай забаўкі,
жорсткай у шалах руху.

Мроіцца:
крохкае голле,
ягада выспеленая
гатовы вытрываць боль —
толькі б пазбыцца
не с в а й г о суседства.

## **Часу келіх**

Глыток бясконцага памкнення
у плынным келіху чакання —
то не блізнятак-хвіль адлік —
агністае, пякучае трыванне
над вогнішчам заўзятым,
ці дажджавое кроплі ласка
паныламу, прывяламу лісту.
А можа, толькі мроя, летуценне —
у плынным келіху чакання
глыток бясконцага памкнення...

* * *

*М. Бушчыку*

Існае колерам выкажаш.
Чэрпаць глыбока з сябе
нястомным рукам Мастака.
З табою заўжды —
ж у р а в е л ь .

* * *

«Мама, выходзь.
Шпакі пяюць»,—
сын пастукаў
у шыбіну.

Пэўна ж — пяюць!
Аж іскрыцца
белая бяроза
і нашая вясна
у звонкім пошчаку
удзячнае птушынае
хвалы — жыццю,
раскрыленым нябёсам
і роднае зямлі.
Душа пяе!

* * *

Выбіваюся травою,
разгортваюся лістотай.
Маладзіца-вясна ўвішна
прастуе на чоўне часу.

* * *

Уначы і ўдзень,
узімку і ўвосень —
заўжды.
На ільняным палетку
вышыванага мамай абруса
зіхацяць васількі.
Сціплыя — нябесныя —
кветкі Айчыны маёй.

# V
# Пяшчоты барвы

* * *

Золак вітальны.
Агонь кахальны.
Звон вянчальны.
. . . . . . . . . . . . . . .
Сляза развітальная.

* * *

Пранізлівы міг — пазнаванне...
Прэлюдыя ростані, стрэчы.
Густое пакуты заслона.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Калышу й люляю імгненне.
Спавіваю чакальнай надзеяй.
Частую горка-салодкім цярпеннем...

**Крыгаход**

Палкая пакута
змінае берагі
учора шчэ застылае,
да драбніц знаёмае,
сёння —
нечае душы.
Задыханае пачуццё
цярэбіцца на волю.

* * *

Стрэліся:
дзве пакуты,
два маўчанні,
каб мовіць —
каханне.

* * *

Вось сціплае пяро,
якое нясмелы,
мужны птах
майго чакання —
Табе ахвяруе,
каб узляцець
зорнаю птушкай
сустрэчы.

* * *

Чырвона-чорная чарэнь чэрвеня...
Прывялыя белыя гронкі,
водар акацый.
Твой голас —
уваскрасаю надзеяй узнятая
на росным лузе чакання...

* * *

Уласніцаю
не была
і не буду.
Абыходжу
нат
край твае свабоды,
дзе тоіцца выбухам
недавер твой
кожнай жанчыне.
Выбухам,
здольным ураз знішчыць
маю пяшчоту
і нашу Сустрэчу.

* * *

Салёная драбінка рэўнасці
у крыўдзе позняе стрэчы
маўкліва дапытваецца
пра талент пяшчоты.
Ёй, мулкай, шчэ не відно,
як сваім голасам мкне
па-над крыніцай, дзе смагу
у ціхай урачыстасці
наталяюць д з в е пяшчоты.

* * *

Ці чуеш?!
Хіснуліся некуды ўбок
арэлі гамонкі нашай,
выцяліся балюча.

Шматслоўя цяжар —
перацятая рухомасць.

Сумую заўжды па
непасрэднасці галубінай
у шчырай прасторы душы.
Ці чуеш?!

* * *

У балючае люстэрка
                    шчымлівае несустрэчы
глядзіцца
                    майго пачуцця
                                        глыбіня.

* * *

Гарачае, пяшчотнае тугі
усеахопнасць —
мілосць ці пакаранне?!

* * *

Хай не народзіцца тая надзея,
якой суджана стаць падманам,
чарговай выбоінай на тваёй сцяжыне.

* * *

Счакай. Не мітусіся.
Хай рунь зялёная
твайго даверу кволага
абудзіцца ў жыццё.
І я прыйду.

* * *

Там, дзе мяне чакаюць,
але не рады будуць мне,
чаму прыныняю крок?..
Адчыненая брама
просіць гасцінна —
у непагадзь і грамы
там, дзе мяне чакаюць...

* * *

І зноў твой дзень абміне
маю агністую пяшчоту,
мой дзіцячы давер.
Абміне мой ціхі голас,
што ў пакоры распавядае,
як тужліва й самотна мне —
без ц я б е.

* * *

Змаглася стыхія,
акрэсліліся берагі.
На зялёных паплавах
майго пачуцця
пытаюцца пра цябе
кветкі ціхай пяшчоты.

* * *

Пазбягаю сустрэчы з табой,
каб не аслабнуць у шчасці.
Пазбыцца баюся свае
ненавіснае самастойнасці я.
сястрою-пакутай пакрысе
на жыццёвых загонах здабытае.

* * *

Праціснецца скрозь
шчыльную заслону журбы
залацісты, вірлівы прамень.
Назавецца тваім імем.
Кранецца тваімі вуснамі
збалелай маёй душы.
Калі?!

* * *

Натаміліся бліскавіцы.
Прыснулі грамы.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Маўклівых сумоўяў пара.
Сполах сустрэчы ў ростані.

* * *

Абапал майго неспакою
туляцца розныя птушкі.
А яго не відно.
Дзе ты, мой белы бусел?
Святочны, ці завітаеш?..

* * *

У цішы добра чутно, як
набрыньваюць жыццёваю сілаю
зялёныя жытнёвыя каласкі,
а ўсмешлівыя васількі шчасліва
перамільгваюцца з мройнымі аблокамі
над чуйным палеткам
нашае агульнае долі.

Слухаю вячыстую цішыню,
чую, як прарастае лёс.

* * *

Атуленае тваімі далонямі,
скрушлівае семя мае самоты й тугі
раптам успомніла, што калісь
у і н ш ы м засеку прытулак мела.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
А не сцюдзёна абдымкам тваім, любы?..

* * *

Рух колераў гулкіх,
сумоўе журбы й надзеі —
у таемным мігценні
астры ліловай і белай.

У сумоўі журбы й надзеі —
вераснёвае мроі грымота.
Гукаецца з летняга выраю
мне напамін пра цябе.

* * *

Хіба ёсць у лёсу
трывалей строі
ад зрэбнае кашулі,
шытае з вытканага
на суровых кроснах долі
пачуцця
Ільняной апраткі,
адбеленае
працалюбівым сонцам
і шорсткаю плынню часу...

* * *

Толькі б
водбліск гарачых барваў
маёй пакуты-блукальніцы
твой Свет не замгліў.
Малюся...

* * *

Працалюбівая ралля чакання
Закаласіцца спелым пачуццём.

# VI
# Душы прадонне

* * *

Паглыне
ненаежнасць шэрае аблогі
настрою гожае быццё,
страціць свой кірунак
шлях пачуццяў і надзей —
вароніным крылом тугі
цябе зацьміць знянацку.

Чым адкажа
утрапёная душа?

**Паядынак**

Пекла й рай,
дабро й зло,
цемра й святло —
усё гэта я,
тое ражно,
што папярок устае
Боскай святое задумы
аб чалавеку.

*21.04.90, Белград*

* * *

Шаргатлівай лісцёвай парою
у зажураным восені дні
не знаходжу нат хісткае кладкі
да бездані зямное ростані,
лёгка адоленай мною ў сне…

* * *

Няўжо а дно з каліваў
пачварнай гардыні —
злая рэўнасць, дадзеная таленту,
можа ўзысці дасканалым радком
і нарадзіць лагоду?
Не веру!

Ды нешта й ува мне самой
настойліва праціўіцца —
                                        не сэнсу.
Чую,
як шукае прастору мой запал —
разбуральны парастак крыўды,
выпінае з таго ж змяінага клубка —
                                                        гардыні.
Хрысце, ачысці!

* * *

Рэха стогну нечае душы
сцюдзёным вострым гукам
працінае мае грудзі.

* * *

Усім нядобра а чацвёртай раніцы.
*Віслава Шымборска*

Не люблю прачынацца
на рагу начы і дня.
Прымхліва скаланаюся
а чацвёртай гадзіне,
чужая пасярод
насамотненых зор,
натомленых ліхтароў,
нерухомых арэляў,
перапыненых сноў.

Не ведаць бы мне,
як а чацвёртай раніцы
засынаюць навек —
адлятаюць навек...

*10.02.92*

* * *

Зялёная галінка душы —
нямая сведка замовы
віхурыстага памкнення
з марудлівым здзяйсненнем
мусіць ці не штодня
страсаць попел нябыту...

## Няўдзячнасць

Раптам —
пакутны цяжар.
І што?!
Твой найвялікасны дар.
Пастка святла і надзей
у тое імгненне жыццё.
Жыццё —
кволых, дарослых дзяцей.

* * *

Калі ўсё было ўжо — і неаднойчы,
то дзеля чаго паўтор гэты?

Зноў жалобная сцежка быцця
і джалам пакуты працята душа.

Дзеля чаго я зноў шукаю
шлях да Галгофы с в а е?!

* * *

Напрасткі, нацянькі,<br>
          як світанак у летнюю ноч,<br>
          спяшаюся ў радасць.<br>
Між тым —<br>
          доўжыцца шлях.<br>
          Блукаю.<br>
Абмінае прамень<br>
                    сцежку маю.<br>
Не ўмею ц я р п е ц ь.

* * *

Узнёслае памкненне,<br>
няздольнае адолець<br>
плынь уладных абставін,<br>
мусіць быць верным<br>
вернай пакуце,<br>
каб не множыць<br>
дарэмна боль.

* * *

Спрабую даўмецца, чаму
быццам бы і сагрэтая горнім,
самотная душа натужліва
шукае цяпельца дольняе.
Ды анёл ціха падказвае:
«Глянь, вунь тваё горняе
б'ецца крыламі аб столь
цеснай чалавечай галубятні.
Цішэй шукай дзверы —
у с я б е».

* * *

Чую, як вопытная пакута
марна грукае ў браму
са змогі й стомы.
Каб жа й яна змаглася...

* * *

Натомлены, прывялы шлях
маіх адчуванняў, звыклых абставін
натужна спяшае за маім днём.
Дзень жа сумуе па порсткай дарозе,
якая аб стоме не чула ніколі:
адно вольна цячэ сабе ўглыб
чалавечага лесу й агульнага часу.
Баліць...

* * *

Раптоўна адчуецца:
прадонне ўласнай душы
шмат глыбей і страшней
за багну, ля якой увосень
журавіны люблю збіраць.

# VII
# На чырвоным ходніку

* * *

Маю збалелую матулю,
бы Беларусь
            пакутніцу-шыпшыну,
па чырвоным ходніку
вядуць
            ласкавыя анёлкі.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Верую:
травой зялёнаю збаўлення
барве горкай прарасці.

*17.05.91*

* * *

Мяжа горняга й дольняга
ахоплена полымем,
дзе лёсаносныя светы —
ахвяры сцюдзёнай пакуты,
бы з сухое бярозы паленцы,
паспешліва-роспачна ўгору шугаюць.

На мяжы горняга й дольняга
не красуюць валошкі.

* * *

Наканавання абдымкі
множаць сівую журбу.
Перасыхаюць летнія дні.

Над хатай і белым Сусветам —
споведзь салёнага воблака.
Мама цяжка хварэе...

*5.08.91, Дараганава*

* * *

Сцішанай пакутаю
гаротніцы-матулі
запытваецца Лёс
патрабавальна
пра моц і слабасць —
маіх гадоў набытак.

У абалонцы
слабое плоці
нараджаецца
Храм Духу.

* * *

Вогненная сутнасць свячы
мроіць маўкліва
аб палымяным дотыку,
каб урэшце спазнаць
імклівасць узыходжання —
свята здзяйснення лёсу.

Мо гэтак у кожным з нас
гарачае немаўлятка духу
натужліва трызніць аб крылах,
каб у час скарыстаць
сваю спрадвечную сутнасць.

Ды руйнотны вецер шалее.
Сівер марозіць глыбіні.

* * *

Збягаю
ад глухой паныласці,
атрутнага сумніву
у маленне, расой душы
абмытае,—
на светлы шлях,
дзе ўладарыць Існасць.

* * *

Цярністая пакута —
спадарожніца верная
новае вялікае страты,
вострым плечуком
лёгка цесніць
прыціхлую папярэдніцу —
колісь, здавалася,
неадольную валадарку
цэлага свету.

* * *

Ля студні маленства,
пад хатай з бярвенцаў,
натолены ўдосталь
бруістай вадзіцай,
барву церпкую спеляць
у лісці зялёным
зялёныя гронкі
агністай каліны —
матулі рукою
пасаджанай.

*16.07.91, Дараганава*

* * *

Ад краю да краю Лёсу —
то цесная сцежка,
то прывольны бальшак.

Праз зачынены час
зрэдку ўчуеш
сэнс Шляху —
цярпенню ўзнагарода.

*16.07.91, Дараганава*

* * *

Зашмат разоў
мела мажлівасць,
каб вучыцца
хадзіць па водах.

Мела...
Абражаны сіраціна-шанец
падцінаў крыўдліва вусны
пасярод мае паспешлівасці.
Паводкаю выбухнуў час.
Пакута найроднага чалавека
берагоў не знае.

Маю мажлівасць,
каб навучыцца
хадзідь па водах —
салёных.

Вучыць н е п а з б е ж н а с ц ь .

* * *

Захлынуся ў віры адчаю
асмяглае збалелае прасторы.

Узнімуся раптоўна ўгору
ласкаваю хваляй надзеі.

Гаспадар-іспыт вядзе мой час.

* * *

Дадзена зведаць
зачыненае Неба,
пакінутасці роспач,
каб уласнае няўдзячнасці
схованкі пабурыць.

* * *

Прад пакуты кратамі
не бразгае зброя
строгае варты.

З-за кратаў пакуты,
соллю прысыпаных,
мо выведзе Час.

*3.09.91*

* * *

Маўклівую гаркавасць
асірацелае, аслаблае хады
адчуюць толькі, можа,
апалыя кляновыя лісты
ды белы, звонкі іней —
нябёс іскрыстая сляза.

*14.09.91*

* * *

Засціць, засціць, засціць
туманамі мне шляхі.

За кужалем тужлівым
раскашуе іншы свет.
У іншы свет цішком,
крадком вяртаюцца выгнанцы
з накутаю адбеленым крылом...

*14.09.91*

* * *

*А. Бембелю*

У запозненым водары
д з в ю х маміных руж,
падораных мне табою,
смуткуюць
журботны прамень
вераснёвага сонца,
развітальны ўздых
матыля
і твае радочкі...

*3.09.91*

# VIII
# Святла мігценне

* * *

Трывай, душа, трывай!
Заўжды навыраст строі
і занадта бы пакутнае аздобы
жыццю, дасланаму ў свет,
дзе горняга й дольняга
таемнасна спалучаны
залевы духатворныя.
Трывай —
няма другога шляху
у росныя блакіты.

* * *

Разгорнутыя клапатліва
у спагадзе шчырай
аб раллі маўклівай,
перагукваліся далячыні.

Намерала сабе дзялянку —
сейбіт легкадумны.
А цяпер выпінаюся
з сіл астатніх, каб
не пагінула без вады
бездапаможнасць кволая,
мне па вясне давераная.

* * *

*Гаяне*

Пяшчотны дотык вачэй тваіх
Дорыць мігценне Святла.
І збалелае слова
ахінае
золак жыцця.

*25.05.89, Масква*

* * *

Стыхія слова, колеру й гуку
у нябачнай шчэ імклівасці
над кожнаю душой віхурыць,
шукае ўвахода, каб натхнення
іскрынка творчая заззяла
у істоце чалавечай — Божай...

* * *

О вы,
лагодныя пакутнікі,
ласкавыя самотнікі.
Вы — абраныя,
чый сталы дах —
нябёсы расхінутыя.
Чый светлы лес —
са Хрыстом сумоўе.
О вы,
шчаслівыя пакутнікі-самотнікі,
не пакідайце тут астуджаных,
насуперак
спрадвечнаму каменню
пад нашаю рукой.

* * *

Дзіўлюся з твае смеласці:
быццам і не палонка
чужое натомленае збалеласці
тужліва прагне адхлання
пад ціхім водарам ружы...

У міндаля далікатны пах...

Сакавік твае дабрыні
самотнае — чуйным шляхам
зорную Існасць шукае...

* * *

Неўпрыкмет
праз гушчар самоты і абавязкаў
сцежка вывела на паляну,
дзе шмат лагоднага сонца,
пяшчотных колераў кветак,
духмяністых ягад суніц.

* * *

Напятую струну твайго чакання
Шапэнаўскі накцюрн аблашчыць
Сутоння залацістаю тугой…
І далягляд пасунецца ўглыб
Змарнелае, застыглае душы…

* * *

У падстрэшшы
            гарадскога муру,
над мітуслівай грамадою —
            натоўпам адзінокіх
            і сагрэтых лёсаў —
пад апекай Майстра
шчыруюць колеры, анёлы...

* * *

Скрозь кожны дзень
у ціхай лагодзе
я б хацела праходзіць.
Лагодзе, здольнай
пачаць і завершыць справу,
усміхнуцца дзіцяці,
зялёнаму дрэву і кветцы.
Лагодзе, якая ўмее
суцішваць стыхіі.

*21.04.90, Белград*

* * *

*М. Бушчыку*

Усцешана даверам,
бы шчырым позіркам
дзіцяці,
Мастача, я вітаю
нараджэнне Свету —
жарынку Боскага натхнення
у колераў шчаслівае сустрэчы...

*26.02.92*

* * *

Есць людзі,
у якіх уваходзіш,
быццам у Храмы...
Дзе льецца святло
і прарастае
увачавідкі
зямля ў Неба...

# IX
# Цярпення цуд

* * *

Страта існага —
зацятасць квадратаў,
абыякавасць авалаў.

Выбіраю расхінутую прастору,
дзе цярпенне ўводзідь у цуд,
а цуд мацуе цярпенне.

* * *

Паперад спраўджаных надзей,
святочных уваходзін —
самлелы рух крыла,
наскрозь працятага журбой.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Нябёсаў зычны, ветлы бераг
лунае па-над чалавечаю сцязёй.

* * *

Мой час,
пакалечаны стронцыем,
атручаны гербіцыдамі,
час анямелых званоў —
няўтульны кокан,
у якім мушу, бы той брыдкі дзіцёнак
крылатай кветкі эфіру,
пакутна чакаць, ці разгорнуцца
крылы стваральных мажлівасцей,
з палымянай надзеяй укладзеныя
у сцяжыну маю зямную...

* * *

Церніі ацiхлага цярпення
прарастаюць ірдзянымі ружамі
насуперак сцюдзёнае пары.

* * *

Таму,
хто навучаны ўсміхацца
на чарэні чакання,
у абцугах абяцання,
шмат скажа
нат гул прадчування
І цень далёкае залевы.

* * *

Прашуся
з імглістае паныласці,
што засціць мне світанак,
з разгубленых блуканняў,
росшукаў сухіх —
у свет іскрыстае, вільготнае,
бездапаможнае і мужнае,
твае цярплівае душы,
пакутаю гаркой навучанай
ва ўсеадольнай чысціні
распазнаваць нябёсаў рух...

* * *

Напачатку было Слова,
і Слова было ў Бога, і Слова
было Бог.
*Паводле Евангелля*

Боскае ласкі —
адзіна трывалай,
Імгненне,
здаецца,
бясконца
Словам крыжовым трымціць.
Адвечным святам Святла
доўжыцца век чалавечы.
Дакуль?..

* * *

...я не магу ісці са злом,
бо я жыву у чыстым часе,
у безупынным, вечным шчасці —
бо я заўсёды — са Хрыстом...
*Зьніч*

Сумовішся ты з іншым часам —
усеахопным валадарам
дум, памкненняў і надзей.
Усмешліва піеш —
гаркое і салодкае
з кляновае, зямное чашы лесу.
Піеш лагодна, бы
аднекуль добра знаеш край,
дзе восені зацятае не ведаюць
праменныя галінкі і лісточкі.
Ты жывеш у іншым —
ч ы с т ы м  ч а с е...

* * *

Адчыняецца Неба насустрач
маленню пра сябра.
І старыцай вяртаецца ўласная сіла,
тады, як ужо не чакаеш падмогі,
а толькі плывеш
настойліва-ціха
шляхам
агульнай
пакуты.
І дбаеш аб тым,
каб
хапіла дыхання другому
уліцца ў Вечнасць
і пазваць за сабою...

* * *

Дзень да дня —
і вось яшчэ адна
слязой амытая прыступка —
шчырая выява вернасці
жыцця, ізноў здабыўшага сабе
працяг зямной сцяжыны
сваёй даверлівай мальбою —
у журбе, ціхмянай, светлай...

* * *

Прамяністае імгненне —
чуйны вечнасці лісток,
падхоплены рукою Мастака,
скіруе дзень у цішыню —
на шлях да светлае сябрыны.

*19.11.90*

* * *

Якою мушу быць,
каб не здарожыцца раней часу
і не спазніцца на сустрэчу з сабою?

Што мушу рабіць,
каб спраўдзіць наканаванае ад веку,
ды не заблытаць свой лёс, а
Спатканнем шлях зямны завершыць?

Маўклівы прастор. Цішыня.
Зялёныя парасткі Надзеі.

*15.04.90, Белград*

* * *

Белы-белы палетак маёй тугі.
Праз здранцвеласць прадзіраецца боль.
Ажываю.

* * *

Пабольшае прасторы ціхае.
Выбаўлюся ўрэшце з няволі.
Спытаюся ў халоднага люстэрка
пра новыя срэбныя сцежкі —
водгулле пякучай завеі,
што недзе паблізу затаілася.

* * *

Пакуль дрыготкае здзіўленне
у чуйнасці сваёй не зможацца
адкрыццем ранішнім, вясновым
душу зямную хваляваць —
прымаць удзячна нам
жыцця вялікаснага плынь,
празрыстай яснасцю кранутую,
бруістую у плёскаце стыхій.

* * *

Праз
застыласць абыякавых сумётаў
спрабую пракладаць сцежку.
Шукаю
уседаравальнага разумення цяпельца,
тое,
што спрадвеку жывіцца аднымі
лагоднымі паленцамі ціхамірнасці.

* * *

Хто ўнікае шляхоў
па прадоннях, дзе
гаснуць колеры,
нямеюць гукі,
а заняпалыя сэнсы,
здранцвелыя мроі —
як перасохлыя ручаі,
той шчаслівец
не ўчуе шолаху крылаў
прамяністае Існасці
над вясноваю нівай
н а т х н е н н я .

*19.03.92*

* * *

Пасля,
ужо пасля ўсяго,
як выпарыцца кропелька
майго нясмелага жыцця,
пазнаю я, што розніцы няма
паміж бурліваю вясною
і ціхай восені хадою,
бо ўсё — нат век — імгненне,
водбліск зорнае стыхіі.
І мы спяшаемся, ляцім
у неўміручыя прасторы —
бясконцасць вечнага
ц я п е р.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

## ЗМЕСТ


*I. КРЫЖА ЗАСЕНЬ*
«Абпаленая і перасохлая…»
«Ніцма. Лямант душы апаў…»
«У святло…»
«Калі набягае раса нябесная…»
«Напругу…»
«Божа! Насуперак спёкам…»
«Ісус — Айчына…»
«А мабыць, улада…»
«Спачуваю добрым намерам…»
«Маўчанне Госпада — побач…»
Вялікдзень
«І зноў — вясновая пара!»
У храме

*II. СМУТАК І ТАЙНА*
«Кожны. Усе…»
«Няўжо вясновае галіны-долі…»
«Ці выратуюцца добрыя…»
«Вось зеўрае пространь тупога адчаю…»
«Дасканалай Любові…»
«Долі сваей далакопы сляпыя…»
«ЦІ маю права…»
«Стратлівы лес галубіць…»
«Было. Каб жа навіна…»
«Урослыя дзірваны забыцця…»
«Усё. Спапеленыя мажлівасці…»
«Няўрымслівы палетак майго чакання…»
«Адчайна праціўлюся я ратунку свайму…»
«З дня ў дзень…»

*III. НАДЗЕІ ПАРАСТАК*
«Надзея маўклівая…»
«Неўпрыкмет выспеў час…»
«Як памагчы той кволай…»
«Углядаюся ўглыб свае душы…»
«Сусвет распасцёрты над лесам маім…»
«Замасціць дрыгву-адчай…»
«Зрушацца няўмольныя пласты…»
Жыццё
«Прывід кволай самастойнасці...»
«Хваравітую пакуту…»

*IV. УСКРАЕК ТЫСЯЧАГОДДЗЯ*
«Не натоўп — зморанае, разгубленае чалавецтва…»
«Сплывае імглістасць суровых вякоў…»
«Ажыла званіца…»
«Сваім слабым, мітуслівым словам…»
Зямля
«Абуджаны ў пакуце дух…»
Услед Асі
«Абняла сясцёр…»
Тужлівае
«Настойліва ірдзяная рабіна…»
Часу келіх
«Існае колерам выкажаш…»
«Мама, выходзь…»
«Выбіваюся травою…»
«Уначы і ўдзень…»

*V. ПЯШЧОТЫ БАРВЫ*
«Золак вітальны…»
«Пранізлівы міг — пазнаванне…»
Крыгаход
«Стрэліся: дзве пакуты…»

«Вось сціплае пяро…»
«Чырвона-чорная чарэнь чэрвеня…»
«Уласніцаю не была…»
«Салёная драбінка рэўнасці...»
«Ці чуеш?!.»
«У балючае люстэрка…»
«Гарачае, пяшчотнае тугі…»
«Хай не народзіцца тая надзея…»
«Счакай. Не мітусіся…»
«Там, дзе мяне чакаюць…»
«І зноў твой дзень абміне…»
«Змаглася етыхія…»
«Пазбягаю сустрэчы з табой…»
«Праціснецца скрозь…»
«Натаміліся бліскавіцы…»
«Абапал майго неспакою…»
«У цішы добра чутно…»
«Атуленае тваімі далонямі…»
«Рух колераў гулкіх…»
«Хіба ёсць у лёсу…»
«Толькі б…»
«Працалюбівая ралля чакання…»

*VI. ДУШЫ ПРАДОННЕ*

«Паглыне ненаежнасць шэрае аблогі...»
Паядынак
«Шаргатлівай лісцёвай парою...»
«Няўжо адно з калівяў…»
«Рэха стогну нечае душы…»
«Не люблю прачынацца…»
«Зялёная галінка душы…»
Няўдзячнасць
«Калі ўсё было ўжо...»
«Напрасткі, нацянькі…»

«Узнёслае памкненне…»
«Спрабую даўмецца, чаму…»
«Чую, як вопытная пакута…»
«Натомлены, прывялы шлях…»
«Раптоўна адчуецца…»

*VII. НА ЧЫРВОНЫМ ХОДНІКУ*

«Маю збалелую матулю…»
«Мяжа горняга й дольняга…»
«Наканавання абдымкі…»
«Сцішанай пакутаю…»
«Вогненная сутнасць свячы…»
«Збягаю ад глухой панылаеці…»
«Цярністая пакута…»
«Ля студні маленства…»
«Ад краю да краю Лёсу…»
«Зашмат разоў…»
«Захлынуся ў віры адчаю…»
«Дадзена зведаць…»
«Прад пакуты кратамі...»
«Маўклівую гаркавасць…»
«Засціць, засціць, засціць…»
«У запозненым водары…»

*VIII. СВЯТЛА МІГЦЕННЕ*

«Трывай, душа, трывай!..»
«Разгорнутыя клапатліва…»
«Пяшчотны дотык вачэй тваіх…»
«Стыхія слова, колеру й гуку…»
«О вы, лагодныя пакутнікі...»
«Дзіўлюся з твае смеласці…»
«Неўпрыкмет…»
«Напятую струну твайго чакання…»
«У падстрэшшы гарадскога муру…»

«Скрозь кожны дзень...»
«Усцешана даверам...»
«Есць людзі...»

*IX. ЦЯРПЕННЯ ЦУД*

«Страта існага...»
«Паперад спраўджаных надзей...»
«Мой час...»
«Церніі аціхлага цярпення...»
«Таму, хто навучаны ўсміхацца...»
«Прашуся з імглістае панылясці...»
«Боскае ласкі — адзіна трывалай...»
«Сумовішся ты з іншым часам...»
«Адчыняецца Неба насустрач...»
«Дзень да дня...»
«Прамяністае імгненне...»
«Якою мушу быць...»
«Белы-белы палетак маёй тугі...»
«Пабольшае прасторы ціхае...»
«Пакуль дрыготкае здзіўленне...»
«Праз застыласць абыякавых сумётаў...»
«Хто ўнікае шляхоў...»
«Пасля, ужо пасля ўсяго...»

Тварановіч-Сеўрук Г.

Ускраек тысячагоддзя: Вершы. — Мн.: Маст. літ., 1996. — 143 с.

ISBN 985-02-0202-5.

Паэтычная кніга Г. Тварановіч-Сеўрук — цэлы пласт філасофскага роздуму над праблемамі нашага жыцця, нашых намаганняў, трывог, радасцяў і бедаў. Паэтэса спрабуе выказаць тое, што «выгаворваецца адно цішынёю вачэй, адкрываецца нязмушана, пакрысе спеліцца часам, а ва ўладзе паспешлівай натугі — згасае».

Літаратурна-мастацкае выданне
ТВАРАНОВІЧ-СЕЎРУК Галіна Паўлаўна
Ускраеіс тысячашддзя
В е р ш ы
Рэдактары *Р. М. Яўсееў, К. Я. Жук*
Мастак *Н. Л. Салаўёва*
Мастацкі рэдактар *А. М. Малышава*
Тэхнічны рэдактар *Т. М. Сокал*
Карэктар *Л. П. Бялова*
Здадзена ў набор 22.11.95. Падп. да друку 01.03.96.
Фармат 70Х90'/32. Папера кн.-часоп. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. аріс. 5,26. Ум. фарб.-адб. 5,42. Ул.-выд. арк. 2,21. Тыраж 1000 экз.
Зак. 1585.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура»
Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку.
Ліпэнзія ЛВ № 3.
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Друкарня «Перамога». 222310, г. Маладзечна,
вул. Таўлая, 11.